# ***Хвілінкі-весялінкі***

1. Паўднёвае, слыннае, вечназялёнае,
Само гэта дрэва
Нам мала знаёмае.
Ды, пэўна, чыталі
Ці чулі падчас:
Частуе пладамі,
Прыправаю нас.
Ці знойдзеш замену алею, маслінам?
А трэба —
Становіцца маслам машынным.
Хоць нам сустракаюцца
Рэдка надзіва,
Ды назва адна ў іх.
Якая? ….. **(Аліва)**



Алена Велянцэвіч
2. Ён — дрэва лісцёвае,
рэдкае, ды
Ён часткай саней
Станавіўся заўжды,
Як звязваў надзейна,
Трывала палоззе,
Каб без папярэчыны
Не распаўзлося.
А вы паразважце,
Мне дайце адказ:
Ці чулі найменне,

Ці бачылі … **(вяз)**

**Мікола Чарняўскі**

**Чмель і мурашка**

Рубрика: Апавяданні

Хлопчык вяртаўся з горада ў сваю родную вёску, што тулілася за лесам. Слухаючы спевы птушак, зайшоў пад зялёныя



сасновыя шаты. Неўзабаве злева ад дарогі перад ім адкрылася вялікая паляна. Хлопчык прыпыніўся.

І раптам пачуў неспакойнае і непарыўнае гудзенне нейкага насякомага. Хлопчык прыгнуўся да зямлі, пачаў пільна ўглядацца ў траву. І ўбачыў вялікага бухматага чмяля. Небарака ніяк не мог узляцець. На спіне ў яго, на адным крылцы, сядзела мурашка.

Хлопчык падняў з зямлі ссохлую галінку і нахіліўся над чмялём, каб скінуць з яго пякучую мурашку. Але вызваліць крылатае насякомае ад бяскрылага не ўдавалася, бо чмель бег не спыняючыся. За лічаныя хвіліны ён пераадолеў дарогу і скіраваўся на паляну. І толькі на ёй хлопчык злаўчыўся і скінуў мурашку з чмялінага крылца. Вызвалены чмель імгненна ўзняўся ў паветра.

Хто ведае, калі б не хлопчык, можа, і замучыла б маленькая мурашка вялікага чмяля…



**Прывітанне!** Дапамажы Васю Вясёлкіну прачытаць словы з лішнім складам. Напрыклад, у слове **САМАСНА** склад **МА** — лішні. Прыбяром яго — і атрымаецца слова **САСНА**. Зразумеў? Давай паспрабуем.

КАКАРАВА
КАЛАСОССЕ
БАРАБАВІК
ЗЯЛЯЗЮЛЯ
ПОРУСАЧАНЬ

КАРОБАВА
ВЕРАГОБЕЙ
ЛІЧЫПА
АКАЛАЦЫЯ
ПАГАЛАЦ

**Спартыўныя загадкі**
Мы плывём па рэчцы шпарка,
Мы вяслуем на…
Стужкі, абручы і мячыкі —
Гэта цацкі для
Вышэй за неба скокнуць рады
На батутах
У кошык забівае гол,
Хлапец гуляе ў
**Дзед Бялын**
*Адказы: байдарках, гімнастыкі, акрабаты, баскетбол.*

## Страх

Не паспела дзіця нарадзіцца на свет Божы, як адразу ў яго маленькую душу пасяліўся Страх. І адкуль ён толькі ўзяўся — Страх гэты? Сядзіць ды падбухторвае дзіця:
— Крычы, а то маці пойдзе некуды і ты застанешся галодны!
Дзіця : — А-а-а-а-а, — давай раўсці, а маці падыйдзе да яго, возьме на рукі ды і скажа ласкава:
— Чаго ты крычыш дурненькі, тут я, тут і нікуды ад цябе не пайду, не пакіну, супакойся!
Дзіця змаўкае… а Страху зноў няймецца, зноў палохае.
І што толькі ён — страх гэты не вырабляў з дзіцём. А той раве і раве. Змучыў маці ушчэнт. А калі дзіця захварэла Страх наогул перабраўся ў сэрца маці. І тая бедалага падалася страху. Рукі сабе ламае, голасна лементуе . А Страх усё разрастаецца. І так ужо яму хораша. Што і сказаць нельга.
А вось прыйшоў урач паглядзеў дзіця. Прапісаў лекі. Дзіця здаровае. Маці ўсміхаецца. Куды Страх падзеўся? Малое ўжо ўстаць хоча, а Страх сваё:
— Не ўставай! Пляснешся!
А малому да ўсяго цікаўнасць. Ручкі цягне, на ножкі стаць хоча. Устала. Стаіць. Хістаецца.
А страх яму:
— Вось зараз паляцім. Ай паб’емся.
Малое тэп-тэп і пайшло па хаце.
Страх занепакоіўся! Чым большым робіцца дзіця, тым меньшым робіцца яго Страх. Асабліва вольна сябе адчувае Страх у начы. Наганяе малому ў галаву розных думак: і пра ваўка, і пра здань несусветную, і пра нешта ў цёмным куце, што сядзіць і цікуе за ім. І пад коўдру хаваўся малы і вочы заплюшчваў, а Страху радасць.

—Мой малы, мой, нікуды ад мяне не дзенецца. —думае.
Дзіця засыпае і страху няма чаго рабіць і ён таксама ідзе наўпакой. Зрэдку ў сне да дзіцяці прыходзіць, але там яму добранька дастаецца, то дубцом, то кійком, а то і проста кулаком. Уцякае Страх з дзіцячых сноў!
А ў дзень не-не ды зноў прыходзіць. Час ідзе, дзіця расце і з страхам ў яго змагацца, часам і перамагае, але Страх хітры, з'яўляецца тады, калі яго нават і не чакаюць. Раптоўна! Але дарослыя дапамагаюць малому і той перадольвае Страх..
— Чакай зла, — думае Страх — падпільную я цябе, калі побач наогул нікога не будзе. І памагчы табе будзе каму.
А час-гарэза ўсё ідзе і ідзе і не дае спыніца цябе. Дзіця ўжо амаль што вырасла, але яшчэ пакуль дзіця. Чакае Страх сваей часіны, каб назаўсёды пасяліцца ў дзіцячай галаве, а можа ў сэрцы — хто ведае.
І вось Страху здалося, што часіна настала. Ішоў малы пад вечар лесам. Грыбы ўжо сам хадзіў збіраць. Раптам неяк усё змеркла. З-за хмар і сонца не відаць. Пярун-маханка, навальніца, а вунь у горадзе ругай і кладня… Навокал ціх, ціха стала струменіць дождж нібы з вядра, ды раптам штосьці заскражытала. Ды так жалабна, бы з мальбою, заве каб хтось памог яму.
Малы сагнуўся, а Страх рады! "Цяпер ты мой, цяпер ты мой. Ну што спыніўся, ці мо і ногі ўжо не йдуць?" Ды, што гэта ?і Малой ідзе і не да кладні, а ўздоўж берага ідзе. Цікуе ён адкуль гучыць енк , і хто просіць дапамогі. Ды вось жа вось — шчанок да берага прыстаў . Дзярэ ён лапкамі зямлю, а вылезці ніяк не можа. Круты і слізкі бераг той.
А Страх у галаве свіркоча —" Нялезь, сарвешся! Ніхто табе не дапаможа. Са шчанком табе хана. Сарвешся, бераг слізкі, слізкі. Ідзі дамлў пакуль жывы , бо шчэ прастудзішся, глядзі дасць маці добрых наганянак. Адзін нікуды больш не пойдзеш! Сядзець у хаце будзеш ты!"
Дзіця не слухаецца Страха, на бераг жыватом лажыцца і цягне рукі к шчанку. А той нібы ўсё разумее, стараецца з нямалых сіл і гэтак жаласна скугоча, што слёзы ў хлопца пацяклі, ці можа дождж цячэ па твары.
"Давай жа лапку, ну давай. Табе я зараз памагу. Ды ціха ты, не вырывайся. Цябе я ўжо не адпушчу. "
І вось на беразе дрыжаць два "шчанюкі", але ж і радыя абодва, але хто болей не відаць.
А дзеж той Страх? Куды падзеўся? Нідзе яго ўжо не відаць.
Па кладцы хлопец крочыць смела, а на руках яго — сябрук, хоць і дрыжыць , а не ад страху, худчэй ад радасці уражыць.

Бачыць Страх, што нізасталося яму мейсца ні ў галаве, ні ў сэрцы хлопца… Вырашыў як можа хутчэй шукаць сябе новую ахвяру. Можа Страх да цябезавітаў?

**Леанід Улашчанка**

## Самы смелы

Сяргей ПАЛІКАРПАЎ

Галоўны ў лесе мядзведзь. Усе клічуць яго Лапатычам, бо лапы вельмі вялікія. Калі Лапатыч зараве, лясныя жыхары павінны сабрацца на паляне.

Падзьмулі цёплыя ветры, прыгрэла сонейка, пабеглі ручаі. Незадаволены мядзведзь вылез са сваёй бярлогі, дзе яму было зручна бачыць салодкія сны. Ён агледзеўся вакол і падумаў: “Ужо вясна. Трэба склікаць усіх звяроў, сказаць, што янапрыйшла”. Ён гучна зароў і скіраваўся ў бок паляны. Але не прайшоў і дваццаці крокаў, як у яго касматы жывот урэзаўся заяц.

– Куды бяжыш, даўгавухі? – зароў мядзведзь.

– Бяда! – залапатаў заяц. – На зборнай паляне аб’явілася страшня пачвара. Рогі вялічэзныя і раве так, што вушы дрыжаць і хвост закручваецца.

– Ды ў цябе і хваста няма, – сказаў мядзведзь і, зірнуўшы сабе за спіну, ціха дадаў: – Ды і ў мяне з хвастом не вельмі. Чаго нам баяцца? Пайшлі!

Пад дрэвамі побач з палянай сабраліся ўсе звяры. Але выходзіць не спяшаліся.

– Дзе тут пачвара рагатая? – гучна спытаў мядзведзь і ганарліва выйшаў на паляну, у самым цэнтры якой расла тоўстая і расшчэпленая маланкай хвоя.

Падзьмуў вецер. Вялікія галінастыя рогі, якія былі бачны паміж галінак хвоі, заварушыліся. Пачвара зараўла.

Мядзведзь, пачаў адступаць і схаваўся ў ценю дрэў. Потым, пазіраючы ў бок паляны, сказаў:

– Мы не ведаем, што за звер за хвояй схаваўся. Трэба, каб нехта паглядзеў. Хто жадае?

Звяры маўчалі. Лось жаваў галінку лазы. Вожык выставіў іголкі.

– Заяц не можа, – сказаў мядзведзь. – Ён сам сябе баіцца.

– Баюся, – пацвердзіў заяц.

– Воўк?

– Не, Лапатыч. У мяне зубы баляць, які ж я абаронца? – Заявіў воўк і ашчэрыў пашчу, поўную здаровых і вострых зубоў.

– Тады ліса.

Але ліса зрабіла выгляд, што нічога не чуе.

Лапатыч падумаў ужо, што прыйдзецца пайсці самому, але заўважыў мышаня.

– Ты маленькае, – сказаў ён – Цябе ніхто не заўважыць. Ідзі!..

Калі Лапатыч сказаў, трэба выконваць. Мышаня пайшло ў бок расшчэпленай хвоі. Звяры згрудзіліся на краі паляны. Адзін толькі лось усё жаваў галінку. Калі падымаўся вецер, пачвара зноў варушыла рагамі і раўла. Мышаня стала нябачна. Звяры заварушыліся, захваляваліся. Але мышаня ўжо бегла назад.
– Ну, хто там хаваецца? – Адразу ж спыталі звяры.
– Ніхто, – адказала мышаня – Захраснуліся ў дрэве рогі, а калі дзьме вецер – дрэва рыпае.
– Ро-о-о-о-гі, – усё павярнуліся да лася.
Лось, які нарэшце дажаваў лазу, здзіўлена паглядзеў на звяроў:
– А я што? Я нічога. Увосень, калі лісце з дрэў падала, Лапатыч усіх сабраў, каб абвясціць зіму. Я стаяў каля сасны. Не заўважыў, як мае рогі адваліліся. Час падышоў. А потым мяне і не пыталі.
Мядведзь толькі ўздыхнуў:
– Калі усе на месцы, аб’яўляю вясну!
Звяры разбрыліся па сваіх справах. І ніхто не згадаў пра мышаня, якое толькі што хадзіла на сустрэчу з невядомай небяспекай. Бо не той смелы, хто вялікі і моцны, а той, хто свой страх пераадолеў.

## Бацькоуская любоу

Ірына ЦУКАНАВА

Шмат гадоў таму ў гарадскім парку на высокай гары рос дуб-волат з магутнай зялёнай кронай і моцным ствалом у некалькі абхопаў. Пра яго ўзрост ніхто не ведаў. Ды і сам дуб забыўся, колькі стагоддзяў ён на зямлі стаіць.
Кожную вясну з поўдня прыляталі птушкі. Ладзілі на галінах дуба гнёзды. Праз нейкі час з’яўляліся на свет птушаняткі. Яны ўвесь дзень пішчалі і прасілі есці. Бацькі раз за разам насілі ім жучкоў і чарвячкоў. А дуб, асцярожна ківаючы галінамі, закалыхваў птушанят.
Стары дуб любіў шумных суседзяў і сумаваў, калі яны адляталі восенню ў цёплыя краіны. З высокай гары ён махаў галінамі ўслед птушкам, а потым да вясны чакаў іх вяртання з далёкага выраю. Сваіх сыночкаў-дубочкаў Бог дубу не даў, з-за чаго ён вельмі пакутаваў.
Але вось аднойчы сонечным восеньскім днём пад яго кронай збіраў жалуды рудавалосы хлапчук. Ён выбраў самы вялікі жолуд і закапаў яго непадалёк ад дуба ў зямлю, прыкрыўшы зверху лісцікамі. Вясной, калі прыгрэла ласкавае сонейка, на тым месцы, дзе хлапчук закапаў жолуд, з зямлі вылез маленечкі тонкі парастак. Неўзабаве ён ператварыўся ў дубчык, на якім напрыканцы траўня распусціліся першыя лісточкі.

Дуб быў шчаслівы, што ў яго з’явіўся сынок. Пяшчотна аберагаў крохкае дрэўца: захінаў яго сваёй лістотай улетку ад прамянёў пякучага сонца, увосень – ад халодных дажджоў. А ўзімку – абараняў ад ледзяных паўночных вятроў.

Ішлі гады. Сынок на радасць бацьку хутка падрастаў. Ды нечакана прыйшла бяда. Малады дубок захварэў. Яго лісцікі апусціліся, ствол сагнуўся да зямлі. Пазбавіўся спакою стары дуб. Дні і ночы думаў, як дапамагчы.

Неяк прысеў на дуб мудры крумкач. Уважліва паглядзеў на малое дрэўца, якое паціху засыхала, і пракрумкаў:

– Марнее сынок твой ад цябе самога, ад ценю твайго. Без сонечнага святла не будзе яму жыцця.

Узмахнуў крыламі і паляцеў прэч. А ноччу разгулялася бура. Зіхацелі маланкі, у небе чуліся раскаты грому, хвастаў халодны лівень. Усхадзіўся моцны вецер, які роў, як раз’юшаны звер, ламаючы галіны дрэў, кружачы сарваную лістоту ў віхуры свайго шалёнага танца.

– Вецер, ты моцны і магутны! – звярнуўся да яго дуб. – Стары я стаў і лядашчы. Прыйшоў час саступіць месца пад сонцам маладым. Падштурхні мяне з гары, бо мне самому адарвацца ад зямлі не хапае сіл.

Паслухаўся яго вецер. Сабраўшы ўсю сваю моц, ён дзьмухнуў на дрэва. У той жа момант яно затрашчала і са стогнам, ламаючы галіны, рухнула з гары ўніз.

Да раніцы бура сціхла. Узышло яркае сонца і цёплымі жыватворнымі прамянямі сагрэла малы дубочак. Ён з палёгкай уздыхнуў і выпрастаў свой тонкі ствол, лісцікі ажылі і зноў зашалясцелі.

Стары дуб у той жа дзень распілавалі і вывезлі з парка. Дубок-сынок доўга глядзеў бацьку ўслед, і па яго лісціках цяклі ці то расінкі, ці то слязінкі.

Цяпер на гары расце высокі і магутны малады дуб. Нібы вартаўнік, велічна ўзвышаецца над старым паркам. І ніякае дрэва ў ваколіцах не можа параўнацца з ім прыгажосцю і крэпасцю. У густой зялёнай кроне ўюць гнёзды птушкі, а ў прахалодным цені адпачываюць гараджане. Ад пякучага сонца, злога ветру і праліўнога дажджу ўсім дае ратунак гэта дрэва.